**УДК 821.161.3** **DOI 10.52928/2070-1608-2024-72-4-43-47**

# КУЛЬТУРНЫЯ КОДЫ Ў ПАКАЗЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ Ў ЭПАСЕ БЕЛАРУСІ МЯЖЫ XX–XXI СТСТ.

***канд. філал. навук, дац. Л.Г. ДУКТАВА***
***(Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі,***
***Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск)***
***ORCID: https://orcid.org/0009-0003-5401-7932***

*Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца выяўленне асаблівасцей нацыянальнай светапогляднай пазіцыі, занатаванай у эпічных творах беларускай літаратуры мяжы XX–XXI стагоддзяў, у дачыненні да пытання нацыянальнай ідэнтычнасці, пры паказе якой мастакі слова звяртаюцца да культурных кодаў. Аналізуючы погляды даследчыкаў на пытанне нацыянальнай ідэнтычнасці, разглядаючы, як дапасуюцца пэўныя меркаванні да паказу светапогляднай пазіцыі ў творах мастацкай літаратуры, мэтазгодна адзначыць, што выкрышталізоўваюцца тры аспекты: вызначэнне асаблівасцей рыс нацыянальнага характару (адказ на пытанні «хто мы?», «якія мы?»); прасторава-часавы кантыніум мастацкай карціны свету (адказ на пытанні «дзе мы?», «адкуль мы?», «куды мы ідзём?»); выяўленне сэнсавай аб'ёмнасці дыяд «мы – яны», «свой – чужы» (адказ на пытанне «з кім мы?»). Вызначаны асаблівасці рэпрэзентацыі культурных кодаў у эпічных творах сучаснай беларускай літаратуры пры паказе нацыянальнай ідэнтычнасці.*

***Ключавыя словы:*** *культурны код, нацыянальная ідэнтычнасць, беларуская літаратура, эпас, сучасная проза, нацыянальная карціна свету, вобраз, раман, апавяданне, аповесць.*

**Уводзіны.** Мяжа XX–XXI стагоддзяў – гэта адметны перыяд у развіцці беларускай літаратуры. Эксперыменты з жанравымі формамі, якія датычацца ўсіх родаў літаратуры – лірыкі, эпасу, драмы, – з'яўляюцца характэрнымі для сучаснага сусветнага літаратурнага працэсу ў цэлым. Жанравая палітра эпічных твораў беларускай літаратуры перыяду існавання незалежнай дзяржавы даволі разнастайная. У літаратуры Беларусі найноўшага перыяду назіраецца сінтэз жанравых форм: раман-эсэ («Мяжа» А. Федарэнкі), раман-штрыхамі («Юргон» А. Казлова), раман-жыціе («Пакліканыя» В. Коўтун). Аповесці ў беларускай літаратуры 1991 – 2020-х гг. характарызуюцца значным тэматычным і стылёвым развіццём, прадстаўлены ў творчасці А. Асіпенкі, А. Жука, А. Казлова, В. Казько, В. Карамазава, А. Кудраўца, І. Навуменкі, Ю. Станкевіча, А. Федарэнкі і інш. Вялікі корпус мастацкіх твораў сучаснай беларускай літаратуры складаюць малыя эпічныя творы, якія прысутнічаюць у творчай біяграфіі В. Адамчыка, А. Кудраўца, Я. Сіпакова, Б. Сачанкі, М. Стральцова і іншых пісьменнікаў; у гэты перыяд сталі даволі распаўсюджанымі малыя жанравыя формы, якія і раней існавалі ў беларускай літаратуры: прытчы («Заміра», «Клетка», «Пажар», «Перавернуты», «Свой усяму», «Хатнічак», Я. Сіпакова), навелы («Півоня», «Адна капейка», «Дзве гадзіны», «Ліпеньскай ноччу», «Чырвоны мячык», «Чорны кандуіт», «Штурман» Уладзіміра Сцяпана), абразкі («Пошукі ісціны», «Бацькі і дзеці» Л. Арабей) і інш.

Што тычыцца тэматычнага пласту, у эпічных творах беларускай літаратуры мяжы XX–XXI стагоддзяў адлюстравана тэма ваеннага мінулага («Вяртанне да віны», «Не ўсе мы згінем» І. Чыгрынава, «Вайна» У. Гніламёдава), чарнобыльскай аварыі і яе наступстваў («Палыновы вецер» Л. Левановіча), гістарычнага мінулага («Залатая жрыца Ашвінаў», «Вяшчун Гедзіміна», «Альгердава дзіда» В. Іпатавай, «Зубрэвіцкая сага» Я. Сіпакова і інш.), закранаюцца пытанні сацыяльных трансфармацый і маральна-этычных праблем грамадства («Юргон» А. Казлова), пераасэнсавання палітычных падзей даваеннага перыяду савецкай дзяржавы («Заходнікі» Г. Далідовіча, «Воўчая выспа» К. Цвіркі).

Напрыканцы мінулага стагоддзя адбываліся трансфармацыі ў эканамічным, культурным і грамадска-палітычным жыцці краіны, вострa загучалі пытанні дэмаграфічнага, працоўнага, спажывецкага, рэкрэатыўнага пераўтварэнняў грамадства, вызначэння ва ўмовах існавання новай дзяржавы пытання нацыянальнай ідэнтычнасці як стрыжня кансалідацыі насельніцтва дзяржавы. На актуальнасць даследавання нацыянальнай ідэнтычнасці ў дачыненні да мастацкай літаратуры звяртаюць увагу айчынныя і замежныя даследчыкі. Мае рацыю А. Букатая: «У апошні час у тэорыі літаратуры актуальнай з'яўляецца праблема нацыянальнай ідэнтычнасці. Найбольш цікава, яскрава і даступна яна адлюстравана ў літаратуры апошняга дзесяцігоддзя XX – пачатку XX ст. Сутыкненне светапоглядаў прадстаўнікоў розных культур часта вядзе да сінкрэтызму, які ў залежнасці ад асяроддзя можа здацца непрыкметным або, наадварот, ярка прадстаўленым» [1, с. 70].

Мэта дадзенай работы – выявіць асаблівасці светапогляднай пазіцыі, занатаванай у эпічных творах беларускай літаратуры мяжы XX–XXI стагоддзяў, у дачыненні да пытання нацыянальнай ідэнтычнасці, пры паказе якой мастакі слова звяртаюцца да нацыянальных культурных кодаў. Задачы: сістэматызаваць навуковыя ўяўленні, звязаныя з паняццем «нацыянальная ідэнтычнасць»; вылучыць асноўныя пытанні ў дачыненні да адлюстравання розных аспектаў нацыянальнай ідэнтычнасці, на якія трэба звярнуць увагу пры аналізе літаратурных твораў; вызначыць асаблівасці рэпрэзентацыі культурных кодаў у эпічных творах сучаснай беларускай літаратуры пры паказе нацыянальнай ідэнтычнасці.

**Асноўная частка.** На сучасным этапе з улікам працэсаў глабалізацыі і існавання мультыэтнічных дзяржаў шэраг даследчыкаў звяртае ўвагу на тое, што паняцце нацыянальнай ідэнтычнасці ўключае ў сябе як этніка-культурны, так і грамадзянска-прававы аспекты. У першым выпадку, калі акцэнт робіцца выключна на этнічны бок, гутарка ідзе пра нацыю, існаванне якой можа быць не абмежавана пэўнай тэрыторыяй, яднаючымі кампанентамі з'яўляюцца традыцыі, культура, мова і іншыя параметры. Пад нацыянальнай ідэнтычнасцю аўтарскі калектыў выдання «Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе» разглядае канкрэтную эмацыянальна-псіхалагічную, палітыка-ідэалагічную і культурную пазіцыю «як асобных індывідаў, так і этнічнай групы ў цэлым ва ўспрыняцці сябе ў навакольным свеце, якая выяўляецца ў прыняцці імі рашэнняў ва ўсіх сферах гістарычнай дзейнасці» [2, с. 5]. У дадзеным вызначэнні зроблены акцэнт на этнічны аспект у дачыненні да разгляду нацыянальнага пытання. Разам з тым калі гутарка ідзе пра ўзровень правядзення дзяржаўнай палітыкі з улікам нацыянальнай спецыфікі насельніцтва дзяржавы, неабходным з'яўляецца разгляд прававога, этнічнага, культурнага, сацыяльнага фактараў. Насельніцтва Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе – гэта беларусы, рускія, габрэі, палякі, цыганы і інш. Важным пытаннем з'яўляецца вызначэнне ўзаемадзення паняццяў «нацыянальнае» і «этнічнае».

У другім выпадку вызначэнне нацыянальнай ідэнтычнасці звязана з паняццем дзяржавы як палітычнай формы арганізацыі грамадства на пэўнай тэрыторыі. З улікам таго, што шэраг даследчыкаў па філасофіі, гісторыі, сацыялогіі, этналогіі і фалькларыстыцы адзначаюць, што прывалюючая роля надаецца этніка-культурнаму чынніку пры вызначэнні паняццяў «нацыянальная свядомасць», «нацыянальная дзяржава», разгляд грамадзянска-прававога і палітычнага аспектаў таксама мае месца быць, асабліва, калі гутарка ідзе пра інстытуцыйную тэорыю нацыі. На гэты конт здаецца слушным погляд англійскага гісторыка Дж. Хоскінга: «Нацыянальная свядомасць мае два аспекты. Першы – грамадзянскі: нацыя – гэта грамадзяне, якія ўдзельнічаюць – або ўцягнутыя – у стварэнне законаў, іх прыняцце і кіраванне праз выбарныя цэнтральныя і мясцовыя органы, суды, а таксама палітычныя партыі, добраахвотныя арганізацыі і іншыя інстытуты грамадзянскай супольнасці. Другі аспект – этнічная нацыя – гэта агульнасць людзей, аб'яднаных адной мовай, культурай, традыцыямі, гісторыяй, эканомікай і тэрыторыяй» [3, с. 7]. Расійскі даследчык М. Папова ў манаграфіі «Нацыянальная ідэнтычнасць і яе адлюстраванне ў мастацкай свядомасці» адзначае: «Інстытуцыйная тэорыя нацыі <…> дапускае, што нацыя тоесная нацыянальнай дзяржаве, а нацыянальная ідэнтычнасьць штучна кантралюецца "бацькамі нацыі" – стваральнікамі нацыянальнай дзяржавы. Пры такім разуменні нацыі і нацыянальнай ідэнтычнасці дамінуючае месца ў структуры паняцця "нацыянальная ідэнтычнасць" займае грамадзянска-прававы аспект, што характэрна, напрыклад, для нацыянальнай ідэнтычнасці ЗША» [4, с. 17–18].

Існуюць розныя падыходы да вызначэння паняцця «нацыянальная ідэнтычнасць», мэтазгодна звярнуць увагу на падыход, які грунтуецца на інстытуцыйнай тэорыі нацыі, і разглядаць пад нацыянальнай ідэнтычнасцю «стан групавой салідарнасці, які фарміруецца на аснове этнічнага і палітычнага адзінства і ўключае калектыўныя (свядомасць і перажыванне нацыяй сваёй цэласнасці і тоеснасці) і індывідуальныя (усведамленне і перажыванне індывідамі сваёй прыналежнасці да нацыі) узроўні» [5, с. 33]. Пры вызначэнні нацыянальных асаблівасцей неабходна звярнуць увагу на рэфлексію ў мастацкіх творах народнай культуры, псіхалагічных і антрапалагічных асаблівасцей, звычаяў і мадэлей паводзін падчас паўсядзённага жыцця, геаграфічных і гаспадарчых рыс. Палітычны складнік звязаны з пытаннямі дзяржаўнага ладу, гістарычнагу шляху. М. Конышава слушна кажа: «У дзяржаве <…> заўсёды і нязменна захоўваецца нейкі стрыжань, вакол якога будуецца і прайграваецца грамадскае жыццё і які вызначае нацыянальны характар, сацыяльныя нормы і каштоўнасці. Культуролагі называюць гэты нязменны паўтаральны стрыжань нацыянальным культурным кодам, які змяшчае ўнікальныя цывілізацыйныя і культурныя асаблівасці народа» [6, с. 174].

Важным спосабам кансалідацыі любой групы з'яўляецца адчуванне адзінай пазіцыі, фармулюемай з дапамогай займенніка «мы». Разгляд дыяды «мы – яны» з'яўляецца падмуркам для вызначэння рыс нацыянальнай ідэнтычнасці. Роля бінарнай апазіцыі «мы – яны» пры фарміраванні сацыяльнай групы даволі падрабязна разгледжана ў работах Б. Паршнёва [7]. Ідэнтыфікацыя як пэўнага індывіда, так і групы прадугледжвае атрыманне адказу на наступныя пытанні: «які я (мы)?», «дзе я (мы)?», «з кім я (мы)?». А. Рабаў адзначае: «Структура нацыянальнай ідэнтычнасці вызначаецца такімі падсістэмамі, як карціна прасторава-часавага кантыніума, вобраз "Мы", уяўленне аб адносінах з Іншымі – накшталт таго, як структура індывідуальнай ідэнтычнасці, дзякуючы якой дасягаецца цэласнасць уласнага "Я", вызначаецца пытаннямі "дзе Я?" (лакалізацыя ў прасторы і ў часе), "які Я?" (сума фізічных, псіхічных і маральных якасцей), "з кім Я?" (змяшчэнне сябе ў пэўным сацыяльным кантэксце, ідэнтыфікацыя сябе з нейкай групай, з "Мы", і, разам з тым, падкрэсленне ўласнай індывідуальнасці» [5, с. 55–56]. Мае рацыю беларускі гісторык І. Марзалюк: «Пад беларускай нацыяй, у сваю чаргу, разумеецца супольнасць людзей, якія сваю краіну называюць Беларуссю, а сябе – беларусамі. Любая нацыянальная ідэя – гэта адказ на тры фундаментальныя для любога народа пытанні: адкуль мы? хто мы? куды мы ідзём?» [8, с. 310].

Разглядаючы, як дапасуюцца пэўныя меркаванні да паказу светапогляднай пазіцыі ў творах мастацкай літаратуры, мэтазгодна адзначыць, што выкрышталізоўваюцца тры аспекты. Па-першае, вызначэнне асаблівасцей рыс нацынальнага характару («хто мы?», «якія мы?»). Па-другое, гутарка ідзе пра прасторава-часавы кантыніум мастацкай карціны свету («дзе мы?», «адкуль мы?», «куды мы ідзём»). Па-трэцяе, мастацкая аб'ёмнасць дыяд «мы – яны», «сваё – іншае» («з кім мы?»).

Л. Гаранін у манаграфіі «Нацыянальная ідэя ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя» слушна адзначае тры асноўныя рысы светаадчування беларускага народа. Па-першае, воля да жыцця: «здольнасць беларусаў вытрымліваць самыя суровыя выпрабаванні (разруху, эпідэміі, спусташальныя войны, голад з-за неўраджаяў,

эканамічнай адсталасці і г.д.), быццам бы нараджацца нанава і працягваць асвойваць родны край, наладжваць вытворчасць, развіваць навуку, культуру, інстытуты грамадскага жыцця» [9, с. 168]. Пры разглядзе твораў мастацкай літаратуры, трэба мець на ўвазе, што, у дачыненні да нацыянальнай ідэнтычнасці, адказ на пытанне «якія мы?» прадугледжвае разгляд асаблівасцей нацыянальнага характару, маральна-этычных каштоўнасцей і інш. Мэтазгодна пры гэтым вызначыць асаблівасці выкарыстання пісьменнікамі саматычнага, духоўнага, марбуальнага, анімалістычнага, метэаралагічнага і іншых нацыянальных кодаў. Напрыклад, у апавяданні «Львы» І. Пташнікава выкарыстанне анімалістычнага кода дазваляе творцы адначасова паказаць трагічнасць постчарнобыльскай сітуацыі і вылучыць сацыяльныя праблемы. У творы ў адносінах персанажа да адзіноты падчас бяды, да здрады і вернасці выяўляюцца асаблівасці нацыянальнага светапогляду, успрымання трагічнай навалы і здольнасці дараваць і жыць далей. Для паказу трагічнасці лёсу чалавека, супрацьстаяння выкліку часу выкарыстоўваецца анімалістычны код, калі ў рамане «Воўчая выспа» К. Цвіркі прысутнічаюць паралелі паміж жыццём чалавека-ізгоя і ваўка. Воўчая выспа – гэта прыродны неруш, таямніца, якую захоўваў род Караленяў, лясны куток, які стаў апошнім прытулкам для Ігнася, у асобе якога ярка паказана прага да жыцця і адначасова каштоўнасць чалавечай годнасці – выбітныя рысы нацыянальнага характару.

Шэраг твораў на ваенную тэму мастацка-аўтабіяграфічнага плана, калі творцы звяртаюцца да лёсу бацькоўскай сям’і падчас Вялікай Айчыннай вайны. Духоўны код у шэрагу аповесцей беларускіх пісьменнікаў датычыцца такіх рыс нацыянальнага характару, як міралюбства, невынаўнічасць, цярплівасць, жаданне пазбегнуць канфліктнай сітуацыі любымі сродкамі, і гістарычная свядомасць, якая змяшчае ў сябе той факт, што тэрыторыя сучаснай краіны неаднаразова станавілася пляцоўкай ваенных баталій, правакуючы на пакуты насельніцтва ад іх разгортвання, а потым цяжкія часы адраджэння новага жыцця пасля заканчэння ваенных падзей. У апавяданні «Свая філасофія вайны» У. Мароза вайна для чалавека-ваяра – час выбару паміж тым, што можна і што нельга, сур’ёзны іспыт для яго душы. У творы падымаецца пытанне: ці можна не забіваць на вайне, але пры гэтым не здрадзіць, не адвярнуцца ад жадання выканаць свой абавязак абараніць ад ворагаў сваю краіну? Духоўны код грунтуецца на ацэнках, якія чалавек дае сабе і свету: «Чалавек народжаны жыць. І ў той ваеннай калатнечы кожны выкручваўся як мог, па сваім разуменні, каб ацалець. Гэта не азначае, што ўцякаць ад вайны, у атаку таксама можна ісці па-рознаму» [10, с. 98]. З дапамогай духоўнага кода паказана невыаўнічая натура ў постаці беларуса. Аповесць «Vixi» А. Адамовіча – твор пра ваенныя падзеі, у якім прысутнічаюць развагі пра ролю гістарычных асоб у лёсе народаў. У творы з дапамогай персанажнага кода падкрэсліваецца, што каштоўнасць лідара нацыі, лідара краіны ва ўменні абараніць інтарэсы насельніцтва, маючы на ўвазе каштоўнасць чалавечага жыцця. У цэлым, праз выкарыстанне духоўнага кода ў шэрагу твораў беларускай літаратуры найноўшага перыяда паказана, што мудрая душа беларускага народа захоўвае памяць пра тое, што ёй прыйшлося перажыць, і адна з апошніх гаючых ран, пакінутых пякельнымі ўспамінамі пра гады Вялікай Айчыннай вайны, яшчэ доўга будзе знаходзіць адбітак на старонках твораў беларускіх аўтараў.

Па-другое, наступная рыса – адчуванне непарыўнай сувязі беларусаў са сваёй зямлёй. Л. Гаранін адзначае: «Умовай любві беларусаў да свайго роднага краю выступаюць і тыя абставіны, што яны, па сутнасці, ніколі гэты край не пакідалі. Яны не займаліся разбоем ці набегам на суседнія плямёны, не вялі захопніцкіх войнаў, як многія стэпавыя народы (татара-манголы, сельджукі, полаўцы і г.д.), заўсёды заставаліся на захопленых воргамі тэрыторыях, не міграваалі са свайго прыроднага месца, як некаторыя угра-фінскія і славянскія плямёны (венгры, балгары і г.д.)» [9, с. 168–169]. Пра ролю вызначэння асаблівасцей прасторы і часу пры разглядзе пытання нацыянальнай ідэнтычнасці адзначае нямецкі даследчык К. Хюбнер: «Нацыя вызначаецца паводле сваёй гісторыі і прасторы, у якой гэтая гісторыя адлюстроўвалася» [11, с. 325]. Пры разглядзе катэгорый часу і прасторы пісьменнікі выкарыстоўваюць шэраг нацыянальных кодаў: персанажны (славутыя дзеячы беларускага мінулага, гераізаваныя ў творах сучаснай літаратуры, напрыклад, у рамане «Зубрэвіцкая сага» Я. Сіпакова), раслінны (з дапамогай вобразаў флоры падкрэсліваецца каларыт беларускага пейзажу, непарыўная сувязь чалавека з роднай зямлёй; напрыклад, апавяданне «Рабіна» А. Федарэнкі), прасторавы, часавы і інш.

Адчуванне адзінства нацыі, усведамленне цэласнага «Мы» немагчыма без вобраза роднай зямлі. У літаратуры многіх краін свету прэзентаваны прасторавы код з дапамогай вобраза зямлі, яго выкарыстанне дапамагае выявіць гістарычныя, псіхалагічныя, побытавыя асаблівасці нацыянальнага светаўспрымання. Адказваючы на пытанне, якія адметныя рысы ментальнасці, нацыянальнага характару, гістарычнага лёсу таго ці іншага народа можна паказаць пры вызначэнні культурных кодаў у мастацкіх творах, мэтазгодна звярнуцца да пастулата «Гаспадары сваёй зямлі», рэпрэзентаванага з дапамогай шэрага культурных кодаў у мастацкіх і публіцыстычных творах беларускай літаратуры. Гісторыя беларускай зямлі – гэта гісторыя шляху да сучаснага дабрабыту і міру на Беларусі. Славутыя старонкі нашага мінулага паказаны ў раманах «Меч князя Вячкі», «След ваўкалака», «Жалезныя жалуды» Л. Дайнекі, «Вялікая княгіня» І. Шамякіна, «Храм без Бога» В. Чаропкі, «Кліч роднага звона» Г. Далідовіча, «Зубрэвіцкая сага» Я. Сіпакова і інш. На прыкладзе выкарыстання персанажнага, прасторавага, часавага кодаў у творах беларускіх аўтараў можна вызначыць ідэю гаспадарлівых і беражлівых адносін да роднай зямлі, сваёй справы, нястомнай працы дзеля будучыні беларускага народа, гонару і павагі да гістарычнай памяці, развіцця беларускай дзяржаўнасці.

Па-трэцяе, істотная рыса – прызнанне права на існаванне іншага. Л. Гаранін падкрэслівае: «І нават не проста прызнанне права, а належнае ім пачуццё дачынення іншага да іх уласнага жыцця. Таму свет аказваецца напоўненым для іх усялякімі іншымі істотамі, рэальнымі і міфічнымі, якіх яны ўспрымаюць як “суседзяў”, так

або інакш суіснуюць, прымiраюцца з імі, не маюць на мэце іх выгнанне або знішчэнне» [9, с. 169–170]. У мастацкай прасторы шэрагу літаратурных твораў сучасных беларускіх аўтараў прадстаўнікі рэальнага і міфічнага свету суіснуюць побач. Умоўна-сімвалічнае і гратэскава-абсурдысцкае адлюстраванне свету прыстунічае ў творах В. Казько, А. Асташонка, Барыса Пятровіча, А. Казлова і інш.

З дылемай «мы – яны» звязаны бінарныя апазіцыі «свой – чужы», «нашы – іншыя». Пошук унутранага ворагу спрыяе распаленню барацьбы, канфліктаў. 1990-я гг. – перыяд, калі на пэўны час грамадства сутыкнулася з новымі выклікамі, якія з'яўляліся следствам эканамічных і палітычных зрухаў, – сацыяльным расслаеннем на багатых і бедных, пашырэнне разрыву паміж узроўнем даходу. У аповесцях «Палеская мадонна», «Завіхрэнне», «Без пакаяння», «Зона павышанай радыяцыі» І. Шамякіна сэнсавая аб'ёмнасць дылемы «мы – яны» паказана з дапамогай часавага і персанажнага кодаў – узаемаадносін прадстаўнікоў розных сацыяльных груп падчас правядзення палітыкі перабудовы, складання рыначных зносін, руйнавання савецкага этычнага кодэксу. Усведамленне ўласнага «мы» скіравана на кансалідацыю грамадства, яднанне ўласных інтарэсаў, намаганняў, дзеянняў. Л. Гаранін слушна кажа: «Адным з праяў гэтай рысы нацыянальнага характару з'яўляецца тое, што беларусы ахвотна прымалі да сябе прадстаўнікоў іншых этнічных груп, рэлігійных веравызнанняў, нацыянальных аб'яднанняў. І гэты прынцып выходзіць далёка за межы толькі сацыяльнага значэння, закранаючы іншыя бакі народнага светаадчування» [9, с. 170].

**Заключэнне.** У літаратуразнаўчым аналізе пры выяўленні асаблівасцей светапогляднай пазіцыі ў творах мастацкай літаратуры мэтазгодна адзначыць тры аспекты: вызначэнне асаблівасцей рыс нацыянальнага характару, прасторава-часавы кантыніум мастацкай карціны свету, выяўленне сэнсавай аб'ёмнасці дыяд «мы – яны», «свой – чужы». З дапамогай разгляду культурных кодаў прасочаны асноўныя аспекты нацыянальнага светаадчування. Па-першае, гутарка ідзе пра выбітныя рысы характару беларусаў: прага да жыцця, міралюбства і інш. На прыкладзе эпічных твораў І. Шамякіна, А. Адамовіча, К. Цвіркі разгледжана месца духоўнага кода пры паказе рыс нацыянальнага характару, асаблівасцей духоўных каштоўнасцей беларусаў. Па-другое, падкрэсліваецца роля прасторава-часавага кантыніума ў дачыненні да нацыянальнай ідэнтычнасці. Пры разглядзе катэгорый часу і прасторы пісьменнікі выкарыстоўваюць шэраг нацыянальных кодаў: персанажны (славутыя дзеячы беларускага мінулага, гераізаваныя ў творах сучаснай літаратуры), раслінны (з дапамогай вобразаў флоры падкрэсліваецца каларыт беларускага пейзажу, непарыўная сувязь чалавека з роднай зямлёй), прасторавы, часавы і інш. Па-трэцяе, істотная рыса нацыянальнага светасузірання – прызнанне права на існаванне іншага. Праз персанажны, анімалістычны, духоўны коды ў эпічных творах беларускай літаратуры найноўшага перыяду паказана сэнсавая аб'ёмнасць бінарнай апазіцыі «мы – яны».

ЛІТАРАТУРА

1. Букатая А.М. Теории и проявления идентичности // Белорусско-китайский культурный диалог: история, современное состояние, перспективы: сб. науч. ст. / редкол.: Н.Н. Хмельницкий [и др.]; под науч. ред. Н.Н. Хмельницкого. – Минск: РИВШ, 2014. – С. 70–76.
2. Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: ХХ стагоддзе / М.П. Касцюк і інш. – Мінск: Белар. навука, 2008. – 614 с.
3. Хоскинг Дж. Россия: народ и империя (1552–1917) / пер. с англ. С.Н. Самуйловой. – Смоленск: Русич, 2001. – 512 с.
4. Попова М.К. Национальная идентичность и ее отражение в художественном сознании. – Воронеж: ВГУ, 2004. – 170 с.
5. Рябов О.В. «Матушка – Русь»: Опыт гендерного анализа поисков национальной идентичности России в отечественной и западной историософии. – М.: Ладомир, 2001. – 200 с.
6. Конышева М.В. Лингвистические компоненты национального культурного кода // Актуальные проблемы переводоведения и лингводидактики в контексте межкультурного взаимодействия: сб. науч. ст. – Брянск: Брян. гос. ун-т имени академика И.Г. Петровского. 2021. – С. 174–179.
7. Поршнев Б.Ф. Социальная психология и история. – Рига: Звайгзне, 1982. – 232 с.
8. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці: вучэб. дапам. / І.А. Марзалюк [і інш.]; рэд.: І.А. Марзалюк, Г.Г. Краско. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2022. – 447 с.
9. Гаранін Л.Я. Нацыянальная ідэя ў беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя. – Мінск: Белар. навука, 1996. – 176 с.
10. Мароз У. Свая філасофія вайны // Полымя. – 2012. – № 2. –С. 96–100.
11. Хюбнер К. Истина мифа: [пер. с нем.]. – М.: Республика, 1996. – 447 с.

*Паступіў 14.02.2024*

# КУЛЬТУРНЫЕ КОДЫ В ПОКАЗЕ НАЦИОНАЛЬНОЙ ИДЕНТИЧНОСТИ В ЭПОСЕ БЕЛАРУСИ НА РУБЕЖЕ XX–XXI ВЕКОВ

***Л.Г. ДУКТОВА***
***(Научно-исследовательский центр белорусской культуры, языка и литературы Национальной академии наук Беларуси, Белорусский государственный университет, Минск)***

*Цель данной статьи – раскрыть особенности национального мировоззрения, отмеченные в эпических произведениях белорусской литературы рубежа XX–XXI веков, применительно к вопросу национальной идентичности, при показе которой писатели обращаются к культурным кодам. Анализируя взгляды исследователей на*

*проблему национальной идентичности, целесообразно выделить три аспекта: определение особенностей национального характера (ответ на вопросы «кто мы?», «что мы?»); пространственно-временной континуум художественной картины мира (ответ на вопросы «где мы?», «откуда мы?», «куда мы идем?»); культурные смыслы, транслтируемые с помощью культурных кодов, при рассмотрении диад «мы – они», «свой – чужой» (ответ на вопрос «с кем мы?»). Определены особенности репрезентации культурных кодов в эпических произведениях современной белорусской литературы в связке с рассмотрением вопроса национальной идентичности.*

***Ключевые слова:*** *культурный код, национальная идентичность, белорусская литература, эпос, современная проза, национальная картина мира, образ, роман, повесть, рассказ.*

## CULTURAL CODES IN THE EXPRESSION OF NATIONAL IDENTITY IN THE EPISODE OF BELARUS ON THE BORDER OF THE XX-XXI CENTURIES

***L. DUKTAVA***
***(Center for the Belarusian Culture, Language and Literature researches of the National Academy of Belarus, Belarusian State University, Minsk)***

*The purpose of this article is to reveal the features of the national worldview, noted in the epic works of Belarusian literature at the turn of the 20th – 21st centuries, in relation to the issue of national identity, when demonstrating which writers turn to cultural codes. When analyzing the views of researchers on the problem of national identity, it is advisable to highlight three aspects: determining the characteristics of the national character (answering the questions "who are we?", "what are we?"); space-time continuum of the artistic picture of the world (answering the questions "where are we?", "where are we from?", "where are we going?"); cultural meanings, translated using cultural codes, when considering the dyads "us – them", "us – alien" (the answer to the question "who are we with?"). The features of the representation of cultural codes in the epic works of modern Belarusian literature are determined in conjunction with consideration of the issue of national identity.*

***Keywords****: cultural code, national identity, Belarusian literature, epic, modern prose, national picture of the world, image, romance, novelet, story.*